ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
21
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 10 (1460)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі ўніверсітэт
ТЭЛЕТАЙП
УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

## Прэс-атрад «Журналіст»

быў створаны ў час працоўнага семестра 1984 года пры Рэспубліканскім штабе студэнцкіх атрадаў ЦК ЛКСМ Беларусі ўпершыню ў рэспубліцы. У саставе яго працавалі студэнты факультэта журналістыкі, якія праходзілі практыку ў рэдакцыі газеты «Знамя юности» на студенческой стройке». Высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі, ініцыятыўнасць, дысцыплінаванасць праявілі студэнты В. Жданко, А. Грышкевіч, Т. Падаляк, С. Яскевіч. Іх публікацыі вызначаліся аператыўнасцю, надзённасцю, глыбокім веданнем студэнцкага руху.

А. ХАНДОГІН,
сакратар
ЦК ЛКСМ Беларусі.

## Вялікую падзяку

выказвае адміністрацыя сярэдняй школы № 49 Першамайскага раёна горада Мінска выкладчыкам кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна В. К. Грыгор'евай і Т. М. Смольскай за арганізацыю і правядзенне цыкла сустрэч замежных студэнтаў універсітэта з камсамольцамі школы. Пад агульным дэвізам «Моладзь у барацьбе за мір» былі праведзены гутаркі, дыспуты, лекцыі. Студэнты БДУ прымалі таксама ўдзел у правядзенні палітінфармацый, канцэртаў у школе.

В. ПАЎЛОЎСКАЯ,
дырэктар СШ № 49 г. Мінска.

## Аб задачах

прафсаюзных бюро факультэтаў па арганізацыі і правядзенню зверкі дакументаў членаў прафсаюза ішла размова на пасяджэнні арганізацыйна-масавай камісіі прафкома студэнтаў. Было разгледжана таксама пытанне аб правядзенні агляду-конкурсу паміж факультэтамі па афармленню пакояў прафсаюзных бюро і куткоў прафактыву на факультэтах. Падрабязна абмеркавана асвятленне прафсаюзнага жыцця ў насценным друку і ў шматтыражнай газеце «Беларускі універсітэт» на факультэце журналістыкі.

Н. ТУРОМША,
намеснік старшыні
прафкома студэнтаў.

## Сёння — выдатныя веды, заўтра — эфектыўная праца

*РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!*

## «Вучуся разумець людзей»

**У чым іншым, толькі не ў адсутнасці самастойнасці можна было папракнуць Сяргея. Так лічылі яго настаўнікі ў школе, бацькі. Іменна гэтую рысу выдзяляюць цяпер у характарыстыцы Сяргея і студэнты, і выкладчыкі універсітэта.**

...Усе ў сям'і Багнічаў бачылі сына ў будучым толькі ўрачом. Нарадзіўся і вырас ён у сям'і медыкаў. Бацька ўжо каторы год працуе галоўным санітарным урачом Гарадоцкага раёна. Маці Сяргея таксама мае прамое дачыненне да медыцыны. Яна — загадчыца раённай аптэкі. Ды і старэйшая сястра Таццяна, студэнтка Віцебскага медыцынскага інстытута, у будучым — урачтэрапеўт. А ўсё ж выбраў сабе Сяргей прафесію іншую: вырашыў стаць фізікам. Калі павелдаміў дома, што будзе падаваць дакументы на фізічны факультэт БДУ, бацькі пярэчыць не сталі. Лічылі, што сын ужо дарослы і выбера сабе прафесію сам. І не памыліліся.

Сяргей Багніч зараз студэнт 4-га курса вытворчага патока фізічнага факультэта, выдатнік вучобы. І ўпэўнены: шлях у жыцці выбраны правільны.

— Яшчэ са школы я любіў фізіку. Гэты прадмет мне даваўся лёгка,— гаворыць Сяргей.— Вось і вырашыў пасля школы прадоўжыць займацца любімай справай.

Добра памятае Сяргей Багніч апошні выпускны экзамен у школе. Здавалі фізіку. І хоць гэта быў яго любімы прадмет, хоць ён быў упэўнены ў сваіх ведах, усё ж крыху хваляваўся. На пытанні білета адказваў без падрыхтоўкі. І атрымаў «выдатна». «Лепшы адказ быў у Сяргея»,— скажа на стаўнік потым выпускнікам.

Вучоба ва універсітэце для Сяргея — гэта не толькі набыццё прафесійных навыкаў. Гэта добрая школа адносін у калектыве. А калектыў для Сяргея — гэта яго група. Такія ж, як сам, дапытлівыя і неспакойныя, настойлівыя ў вучобе і вясёлыя ў часы адпачынку юнакі і дзяўчаты. Не можа ён без групы, ды і група без яго таксама.

— Душа калектыву,— гаворыць пра Сяргея камсорг групы Жэня Гулевіч.— Ён умее знайсці не толькі цікавую тэму для размовы, падняць настрой, але і пастаяць за інтарэсы групы, дапамагчы ў вучобе таварышам.

А за дапамогай да С. Багніча звяртаюцца часта, бо ведаюць, што ніколі не адмовіць.

...Група рыхтавалася да экзамена па спецкурсу. Вечарам да Сяргея ў пакой прыйшоў яго аднакурснік, папрасіў разабрацца ў спрэчным пытанні.

— Будзем думаць разам,— адказаў Сяргей.

Спрэчкі, довады, аркушы спісаныя паперы. Сядзелі да таго часу, пакуль не пераканаліся, што пытанне стала зразумелым.

— Галоўнае, калі ў мяне самога ёсць адчуванне добра зробленай справы,— дадае Сяргей.

А ў гэтых справ у яго вельмі многа. Патрэбна паспяваць не толькі добра вучыцца, але і займацца грамадскай работай. Ён — старшыня студсавета інтэрната № 2. Днём — вучоба, а вечарам — пасяджэнні, сустрэчы з цікавымі людзьмі, спаборніцтвы, афармленне чытальных пакояў. Доўга можна пералічваць клопаты старшыні студсавета. Іх заўсёды столькі, што ў іншага і рукі апусціліся б. Але Сяргей не з такіх. Ён настойлівы, патрабавальны.

— Дысцыпліна — перш за ўсё,— так лічыць С. Багніч.— Змагацца з безадказнасцю патрэбна ўсюды, тады і парадак будзе.

І яшчэ: галоўнае для старшыні студсавета — гэта мець арганізатарскія здольнасці. Міхаіл Раманавіч Пасльдовіч, куратар групы, вылучыў іменна іх у характары Сяргея:

— Сяргея паважаюць у групе. Ён мае своеасаблівую рысу — умение арганізаваць калектыў, зацікавіць.

Вось такі ён, Сяргей Багніч: настойлівы ў вучобе, патрабавальны да сябе і таварышаў.

Н. ТРУБЧЫК,
студэнтка факультэта
журналістыкі.

НА ЗДЫМКУ: выдатнік вучобы Сяргей Багніч у вучэбнай лабараторыі.
Фота А. ВАЛОШЫНА.



*ГАВОРАЦЬ ЗАМЕЖНЫЯ СТУДЭНТЫ*

## ХАЙ ЗАЎЖДЫ БУДЗЕ МІР!

ГЭТЫЯ МАЛАДЫЯ людзі прыехалі з розных краін свету Прыехалі, каб набываць веды ў Савецкім Саюзе. Зараз усе яны — слухачы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян. Заняткі, розныя мерапрыемствы, сустрэчы з цікавымі людзьмі, знаёмствы з краінай — дні запоўнены цалкам. Але ўсё ж часта яны ўспамінаюць аб сваёй радзіме.

«Наша радзіма — сацыялістычная Эфіопія. Наш народ выступае за захаванне міру не толькі на афрыканскім кантыненце, але і ва ўсім свеце»,— пішуць студэнты з Эфіопіі. Гэта зусім не выпадкова: успамін аб радзіме і словы аб міры.

«Вось ужо дзесяць гадоў ліванскі народ вядзе барацьбу супраць агрэсіўнай палітыкі ЗША на Блізкім Усходзе. Мір — гэта пытанне, якое хвалюе ўсіх жыхароў маёй краіны, і асабліва дзяцей, якія яшчэ не ведаюць, што гэта такое. Мы стаміліся ад вайны і вельмі хочам, каб быў мір». Гэтыя словы належаць Самару Яману, юнаку з Лівана. Але наколькі думка, выказаная ў іх, супадае з думкай аб радзіме яго земляка Хамада Шамаса.

«Мы не ведаем, што такое мір, аднак гэта не значыць, што мы не жадаем жыць у міры. Нам патрэбен мір, але не той, які прапаноўваюць імперыялісты ЗША і іх саюзнікі. Мы не забудзем пра трагедыю Сабра і Шацілы. Мы будзем змагацца да таго часу, пакуль на нашай зямлі не застанецца ніводнага ізраільскага салдата».

«Калі прааналізаваць гісторыю развіцця нашай краіны, то можна зрабіць вывад: нікарагуанскі народ вельмі міралюбівы. Ён любіць мір, які быў заваяваны крывёю герояў, што загінулі ў барацьбе за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы.

Наша барацьба — гэта барацьба за суверэнітэт, гонар, свабоду і справядлівасць. Мы змагаемся, і калі патрэбна будзе, гатовы аддаць сваё жыццё». Эктар Фансека, Нікарагуа.

«Маім суайчыннікам, як і ўсім людзям планеты, не патрэбна вайна. Мы хочам жыць у міры і заяўляем: «Не!» — вайне!» Бінту Цiемока, Малі.

Так, прагрэсіўныя людзі ўсёй планеты адзіныя. Адзіныя ў сваіх думках: «Нам патрэбен мір!», адзіныя ў сваіх імкненнях: «Мы будзем змагацца за мір!».

Пісьмы замежных студэнтаў
падрыхтавала да друку
С. РАМАНАВА.

# СЁННЯ — ВЫДАТНЫЯ ВЕДЫ, ЗАЎТРА — ЭФЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА!

*СЛОВА — ІМЯННОМУ СТЫПЕНДЫЯТУ*

## *СПЕЦЫЯЛІСТЫ XXI СТАГОДДЗЯ*

Я — ПЯЦІКУРСНІЦА. Зусім мала засталося часу, калі мы ўсе, сёлетнія выпускнікі, закончым універсітэт і будзем самастойна працаваць. Перад намі, маладымі, стаіць вялікая задача — будаваць камунізм. Поспех у яе рашэнні залежыць ад якасці нашых ведаў, ад умення выкарыстаць іх на практыцы, разабрацца ў самых складаных пытаннях, працаваць цікава, творча. Трэба сказаць, што ў асноўным студэнты добра ўсведамляюць тую адказнасць, якая ляжа на іх разам з атрыманнем дыплома БДУ імя У. І. Леніна. Сёння каля 53 працэнтаў студэнтаў універсітэта займаюцца на «добра» і «выдатна», значная частка — толькі на «выдатна». Універсітэт ганарыцца сваімі выдатнікамі, якія паказваюць прыклад адказных, сур'ёзных, творчых адносін да вучобы. Сярод іх імянныя і ленінскія стыпендыяты В. Янцэвіч (геафак), І. Паромчык (факультэт радыёфізікі і электронікі), Г. Вегера (біяфак), А. Цітова (гістфак), А. Манастырны (мехмат), І. Сакалоўская (фізфак) і іншыя.

Добрых поспехаў дасягнулі студэнты універсітэта ў навукова-даследчай дзейнасці. Па выніках навукова-даследчай работы студэнтамі было пададзена 20 заяў на вынаходніцтвы; у сааўтарстве з выкладчыкамі надрукаваны 393 навуковыя артыкулы, даклады; 57 навуковых работ былі пададзены на Усесаюзны агляд-конкурс па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Дзве з іх, студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта Ю. Дракахруста і ФПМ А. Кадана, былі адзначаны медалямі Усесаюзнага конкурсу. Шэраг студэнтаў узнагароджаны дыпломамі МінВНУ СССР і ЦК ВЛКСМ. Сярод іх А. Місевіч, Л. Муха (геафак), Т. Касарэўская (хімфак).

Поспехі студэнтаў-выдатнікаў значныя. Аднак ёсць яшчэ шмат пытанняў, на якія нашы выдатнікі могуць і павінны звярнуць сваю ўвагу. Размова ідзе аб павышэнні грамадскай актыўнасці, аб дапамозе выдатнікаў адстаючым студэнтам, аб неабходнасці расшырыць сувязі выдатнікаў са студэнтамі першых курсаў. Тут можна назваць і шэраг іншых напрамкаў дзейнасці, у якой выдатнікі маглі б прымаць больш актыўны ўдзел: работа ў школах юных, правядзенне дзён адкрытых дзвярэй. Усе гэтыя і іншыя пытанні стаяць сёння на парадку дня універсітэцкага савета выдатнікаў. Хочацца выказаць пажаданне, каб усе выдатнікі БДУ імя У. І. Леніна ўключаліся больш актыўна ў яго работу.

**А. ПАГІРНІЦКАЯ,**
**старшыня савета выдатнікаў універсітэта, ленінскі стыпендыят.**

**Дваццаць сем гадоў мінула з таго часу, калі кандыдат хімічных навук, дацэнт, выкладчык кафедры фізічнай хіміі Ігар Іванавіч Пакроўскі быў студэнтам БДУ імя У. І. Леніна. У руках трымаю дыплом Ігара Іванавіча. У ім толькі выдатныя адзнакі.**

*ІНТЭРВ'Ю З ВЫДАТНІКАМ ПРАЗ 27 ГАДОЎ*

## «ПРАЦУЙЦЕ — БУДЗЕ ЦІКАВА»

**— Ігар Іванавіч, раскажыце, калі ласка, як у студэнцкія гады Вы арганізоўвалі вучобу? Што дапамагала Вам вучыцца выдатна?**

— Па-першае, хачу сказаць, што студэнту пяцідзесятых вучыцца было значна лягчэй, чым сённяшняму. Цяпер юнакі і дзяўчаты хімфака вывучаюць амаль у два разы больш прадметаў, чым у мой час.

А што вызначала нашу вучобу? Вялікая адказнасць перад дзяржавай, якая затрачвала шмат сродкаў на наша навучанне. З пяцідзесяці маіх аднакурснікаў каля трыццаці сталі кандыдатамі навук.

**— Ігар Іванавіч, зараз ва універсітэце выдатнікі складаюць прыкладна дзесятую частку. Раней іх было больш?**

— Так, але, назіраючы за сённяшнімі студэнтамі, не скажу, што сярод іх менш таленавітых. Я ведаю троечнікаў, якія дасягнулі пэўных вышынь у навуцы. Хімія — навука эксперыментальная. Гэта заўсёды пошук. Вывучыць матэрыял і атрымаць выдатную адзнаку — яшчэ не ўсё. Можна быць выдатным студэнтам і разам з тым дрэнным даследчыкам. Мне заўсёды падабаюцца тыя, хто займаецца навукова-даследчай работай.

**— Як Вы лічыце, ці ёсць вольны час у выдатніка?**

— Думаю, што няма. Не толькі ў выдатніка, але і ў любога студэнта яго мала. Лічу, што асноўны свой час патрэбна прысвяціць навуцы. Неабходна пастаянна працаваць над сабой. Студэнт павінен сам навучыцца вучыцца, больш быць у лабараторыі, бібліятэцы.

**— Ігар Іванавіч, як, на Вашу думку, ці змяніўся сённяшні выдатнік? Якія яго рысы Вам больш імпануюць?**

— І выдатніка майго часу, і сённяшняга выдатніка аб'ядноўваюць адданасць справе, мэтанакіраванасць. Запас ведаў у выдатніка васьмідзесятых большы. Але выдатнікі ўсіх пакаленняў вызначаюцца арганізаванасцю, рознабаковасцю інтарэсаў. На хімфаку шмат студэнтаў, якія не толькі выдатна вучацца, а і прымаюць актыўны ўдзел у розных мерапрыемствах. Радуюць чацвёртакурснікі Валерый Марцішонак, Дзмітрый Рудкевіч, Аляксей Селянінаў, пяцікурснік Андрэй Шаўня. У кастрычніку на алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» удзельнікі нашай каманды занялі прызавое месца сярод каманд універсітэта. Прыемна адзначыць такіх таленавітых студэнтаў, як Ірына Пачкоўская, Уладзімір Дзікі.

**— Ігар Іванавіч, як веды, атрыманыя ў БДУ, спатрэбіліся Вам на практыцы?**

— Усё тое, чаму вучылі мяне выкладчыкі, спатрэбілася ў рабоце. А якіх ведаў не хапала, атрымліваў у працэсе самастойнай працы. Вельмі спатрэбілася ўменне правільна арганізоўваць час, так, каб яго хапала і на грамадскую работу.

Усім студэнтам я жадаю, каб ім было цікава вучыцца. Таму што няма больш сумнай карціны, чым бачыць чалавека абыякавага, які займаецца не сваёй справай. Хай вам заўсёды будзе цікава. Працуйце, і будзе цікава.

Інтэрв'ю правяла
А. БАНКЕВІЧ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.

*«КРУГЛЫ СТОЛ» РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»*

## ПАМЯТАЦЬ СВАЮ

**А хто такі выдатнік ва ўяўленні саміх выдатнікаў? Для размовы на гэту тэму мы запрасілі ў рэдакцыю Віктара АГАРОДНІКА, Ігара ПРАКАПОВІЧА, студэнтаў гістарычнага факультэта, і Валерыя МАРЦІШОНКА, студэнта хімічнага факультэта.**

**КАРЭСПАНДЭНТ: Тут сабраліся студэнты чацвёртага курса, за плячыма якіх не адзін семестр, не адна сесія. Але давайце ў думках вернемся да таго часу, калі вы ўпершыню пераступілі парог універсітэта ў якасці студэнта. Якой вам уяўлялася вучоба ва універсітэце? Ці такой яна аказалася на самай справе?**

І. ПРАКАПОВІЧ: Паступаў, як, напэўна, большасць, пасля школы. Якія першыя ўражанні? Чакаў чагосьці незвычайнага, а пачаліся будні. Першыя адчуванні — гэта перш за ўсё лёгкасць у вучобе. Першую сесію здаў на выдатна. І пачалося...

В. МАРЦІШОНАК: У восьмым класе я вырашыў быць хімікам. І пасля ўжо ніякіх сумненняў не было. Толькі вось можа ў дзесятым класе, калі выбіраў паміж медыцынскім інстытутам і хімфакам. Выбраў хімію і не шкадую. Усё склалася так, як і ўяўляў. Спадабалася, цікава.

В. АГАРОДНІК: Пры паступленні планаў асаблівых не было. Неабходна было штосьці выбраць. Паспрабаваў здаць экзамены і паступіў на гістфак.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Толькі па неабходнасці?**

В. АГАРОДНІК: Не, вядома. Шмат што залежыць ад схільнасці чалавека. А мне гісторыя падабалася заўсёды.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Звычайна гавораць, што «ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела». А як у гэты час жывуць выдатнікі?**

В. АГАРОДНІК: Таксама, як і ўсе. Не ўсё залежыць ад таго, колькі часу ідзе на падрыхтоўку да заняткаў. Шмат што залежыць і ад умення чалавека сабрацца, хутка знайсці неабходныя звесткі ў даведніку або дапаможніку. І тады сама сесія не будзе нечым страшэнным.

В. МАРЦІШОНАК: Асабіста для мяне сесія — любімы час. Хоць на ўмовы вучобы і на працягу семестра паскардзіцца не магу. Для заняткаў навукай мне дазволілі свабоднае наведванне.

В. АГАРОДНІК: Шкада, што такога няма на гістфаку.

В. МАРЦІШОНАК: Студэнты хімфака, якія добра вучацца, прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, атрымліваюць павышаную стыпендыю.

В. АГАРОДНІК: Так, для студэнтаў патрэбны стымул. Магчыма, неабходна прадугледзець нават павышэнне стыпендыі выдатнікам ад курса да курса.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Першы семестр, першыя знаёмствы, першыя курсавыя мерапрыемствы і першая сесія. Як аднакурснікі аднесліся да вашых адзнак у залікоўках?**



В. АГАРОДНІК: Усякае бывае. Часцей за ўсё адносіны такія ж, як і да ўсіх. Хаця, вядома, бываюць і зайздроснікі, калі нават радуюцца няўдачам. Але гэта толькі адзінкавыя выпадкі.

В. МАРЦІШОНАК: Шмат што залежыць і ад адносін выдатніка да групы.

**КАРЭСПАНДЭНТ: А як ставяцца да вас, выдатнікаў, выкладчыкі? Не сакрэт, што бытуе такі погляд: маўляў, ён выдатнік, і яму заўсёды паставяць добрую адзнаку, як бы ён ні адказваў.**

І. ПРАКАПОВІЧ: Адносіны выкладчыкаў да выдатнікаў у цэлым станоўчыя. Выключэнні сустракаюцца даволі рэдка.

В. АГАРОДНІК: Бывае і прадузятасць нейкая. Усё ведаць немагчыма. А да выдатнікаў і больш высокія патрабаванні. А наогул я згодны з тым, што большасць выкладчыкаў добра ставяцца да выдатнікаў.

І. ПРАКАПОВІЧ: Ёсць, вя-



ДУМКІ ЎСЛЫХ

# АКТЫВІСТ... ДАСЛЕДЧЫК... АРГАНІЗАТАР

ВЫДАТНІК. ХТО ЕН? Над гэтым пытаннем разважаюць выкладчыкі і студэнты універсітэта.

**Мікалай Іосіфавіч ЮРЧУК, дэкан механіка-матэматычнага факультэта, прафесар:**

— Можна выдзеліць тры ас[illegible]ныя паказчыкі для выдатні[illegible]: выдатная вучоба, удзел у грамадскім жыцці, навукова-даследчая работа. Без аднаго з гэтых паказчыкаў выдатнік перастае існаваць.

**Таццяна КРУГЛЕНЯ, сакратар камітэта камсамола геаграфічнага факультэта:**

— Выдатнік вучобы — гэта і камсамольскі актывіст, і чулы, надзейны таварыш.

**Сяргей Уладзіміравіч МАКАРЭВІЧ, загадчык кафедры фізічнага выхавання:**

— Выдатнік — не толькі прыклад у вучобе, але і актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця, арганізатар у групе, на курсе фізічна-масавай работы. Вядома, што выхаванне маладога чалавека ўключае ў сябе і фізічнае развіццё. Сапраўднымі выдатнікамі можна назваць выпускнікоў універсітэта Таццяну Бойка (юрфак), Уладзіміра Гараева (хімфак).

**Юрый Іванавіч ЮШКО, член камітэта камсамола універсітэта, выкладчык:**

— Выдатнік — гэта перш за ўсё эрудзіраваны студэнт, актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця. Палітычна адукаваны чалавек. І не абавязкова, каб у яго былі адны пяцёркі.

**Зоя ІЛЬЯСКЕВІЧ, студэнтка гістарычнага факультэта:**

— Выдатнік — гэта студэнт, які займаецца ў семестры і здае экзамены на пяцёркі.

Запісала
**І. НОВІКАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# АДКАЗНАСЦЬ

дома, і такія выкладчыкі, якія ніколі не паставяць у залікоўку тройку, калі там раней былі толькі добрыя адзнакі, не могуць паставіць «добра», калі там было толькі «выдатна». А такога, як: «А, дык ты выдатнік. Паглядзім, паглядзім» я не сустракаў. Але суб'ектыўны момант, бясспрэчна, прысутнічае.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Цікава было б пачуць вашы меркаванні аб сістэме здачы экзаменаў. Ці сучасная яна?**

В. МАРЦІШОНАК: Вельмі.

І. ПРАКАПОВІЧ: Абсалютна сучасная. Што можа замяніць яе? Чалавеку патрэбна ацэнка яго працы, гэта таксама стымул.

В. АГАРОДНІК: Гавораць, што экзамен — гэта латарэя. Я латарэяй экзамен не лічу. Выдатнік павінен ведаць кожнае пытанне кожнага білета. Экзамен — гэта цікава. Калі добра адказваеш, адчуваеш маральнае задавальненне. Урэшце экзамен — гэта не толькі пытанне і адказ. Гэта і замацаванне ведаў.

І. ПРАКАПОВІЧ: На чым часцей за ўсё заснаваны погляд на экзамен як на латарэю? Не вывучыш што-небудзь — не ведаеш. Вось вам і латарэя. Ды і ад паводзін студэнта таксама многае залежыць. Іншы раз прыйдзе ён на экзамен, нагрубіць. Не ведае адказу на пытанне і ўсё роўна спрачаецца. Выходзіць — латарэя. І ўсё роўна, калі называць экзамен латарэяй, то яна бяспройгрышная. Яе можна перайграць на карысць ведаў.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Выдатнікі перад экзаменамі таксама хвалююцца?**

В. МАРЦІШОНАК: Вядома, хвалююцца.

І. ПРАКАПОВІЧ: Абавязкова.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Мы многа гаварылі аб выдатніках. А хто ён такі, выдатнік?**

В. МАРЦІШОНАК: Я б адказаў так: выдатнік — гэта вельмі свядомы студэнт.

В. АГАРОДНІК: Выдатнік — гэта чалавек, які найбольш паспяхова спраўляецца з праграмай, прымае ўдзел у грамадскай рабоце. Чалавек, які займаецца толькі вучобай,— не выдатнік.

І. ПРАКАПОВІЧ: Чалавек можа звацца выдатнікам, маючы чацвёрку, але быць маяком ва ўсіх справах. Дзеля гэтага, мне здаецца, не абавязкова мець абсалютную паспяховасць. Важна ўсвядоміць сваю ролю і сваю адказнасць, якую накладвае званне выдатніка.

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш кар.**

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ

# «Пагаворым, таварыш ветэран!»

**НАБЛІЖАЕЦЦА слаўнае 40-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Зараслі варонкі і рвы на палях былых баёў, адрадзіліся разбураныя вайной гарады і вёскі. Навечна ў нашай памяці імёны тых, хто прынёс Перамогу. Іх імёны золатам высечаны на абеліcках. Памяць аб героях вечная. Яна вучыць нас любіць Радзіму, абараняць яе беззапаветна і самаадданa.**

**У год 40-годдзя Вялікай Перамогі камітэт камсамола універсітэта звяртаецца з заклікам да ўсіх камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат універсітэта актыўна ўключыцца ў аперацыю «Пагаворым, таварыш ветэран!». Сутнасць яе ў тым, каб кожны ўдзельнік аперацыі сустрэўся з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, раздзяліў яго клопаты, аказаў дапамогу, акружыў цяплом і ўвагай; для стварэння летапісу Вялікай Айчыннай, праслаўлення ратнага і працоўнага подзвігу ветэранаў вайны горада-героя Мінска запісаў успаміны аб суровых днях вайны.**

**Задача аперацыі — устанавіць сяброўскія сувязі са старэйшымі таварышамі, эфектыўна выкарыстоўваць іх багаты вопыт у ідэйна-палітычным і маральным выхаванні.**

**Камсамолец! Актыўны ўдзел у аперацыі «Пагаворым, таварыш ветэран!» будзе тваім важкім укладам у падрыхтоўку да святкавання 40-годдзя Вялікай Перамогі.**

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА.**

КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

# Эканоміць у вялікім і малым

КАМІТЭТ НАРОДНАГА кантролю універсітэта і штаб «Камсамольскага пражэктара» правялі рэйдавую праверку рацыянальнага выкарыстання энергарэсурсаў у вучэбных карпусах і інтэрнатах БДУ. Праверкай устаноўлена, што ў галоўным корпусе вечарам у пяці-шасці аўдыторыях заўсёды гарыць святло, калі там няма ніводнага чалавека. Так, у дзень праверкі ў 20.00 гарэла святло ў аўдыторыях № 478 (фізфак) і № 603 (гістфак), а таксама ў зачыненых кабінетах № 403 (кафедра тапалогіі і геаметрыі) і № 405 (кафедра алгебры).

Нерацыянальна выкарыстоўваюцца асвятляльныя прылады і ў інтэрнатах. У інтэрнаце № 2 днём гарэла святло ў блоках №№ 709, 609, 611, а студэнты ў гэты час былі на занятках. Не тушыцца святло і ў ліфтавым пакоі дзевятага паверха. А пытанне, якім чынам засталося напатушаным святло ў чытальных залах шостага і восьмага паверхаў і як доўга яно гарэла б, каб на гэта не звярнула ўвагу рэйдавая брыгада «Камсамольскага пражэктара» журфака, мы адрасуем непасрэдна студсавету інтэрната № 2. Аналагічную карціну мы назіралі і ў блоках інтэрната № 7.

Шмат энергіі страчваецца ў зімовы час з-за выкарыстання дадатковых награвальных прылад. Студэнты тлумачаць гэта тым, што ў пакоях холадна. Сапраўды, нярэдка мы сустракаемся з фактамі непадрыхтаванасці інтэрнатаў да зімы. Ды і самі студэнты не вельмі клапоцяцца аб гэтым: у многіх пакоях нават вокны не аклееныя. У пакоі № 1010а інтэрната № 7 студэнты ўстанавілі два электракаміны сумарнай магутнасцю каля двух кілават. Арыфметычныя разлікі страт электраэнергіі ў гэтым пакоі за зімовыя месяцы мы прапаноўваем выканаць студсавету і гаспадарчым службам інтэрната.

Нямала фактаў сведчаць аб тым, што інтэрнат № 4 таксама не лепшым чынам быў падрыхтаваны да зімы. У двух пакоях вокны не зачыняюцца, а ў чатырох разбіта шкло. Многія студэнты з гэтай нагоды звярталіся за дапамогай да каменданта або ў студсавет, але дарэмна. Такімі ж стратамі цяпла тлумачыцца і выкарыстанне электранагравальных прылад у многіх пакоях інтэрната № 3. Свой «уклад» у страты электраэнергіі ўносяць і студэнты шасці пакояў інтэрната № 6, дзе таксама выкарыстоўваюцца электракаміны.

На нашу думку, адміністрацыйна-гаспадарчай частцы універсітэта, адміністрацыі інтэрнатаў і студсаветам неабходна ўжо ў летні перыяд прыняць усе меры, каб ліквідаваць існуючыя недахопы ў падрыхтоўцы інтэрнатаў да зімы. Шырэй да гэтай работы неабходна прыцягваць студэнтаў. У зімовы перыяд самі студсаветы павінны дакладна наладзіць кантроль за ўцяпленнем пакояў і выкарыстаннем электраэнергіі, не чакаць, калі гэта будзе зроблена кантралюючымі органамі. І нарэшце больш увагі патрэбна ўдзяляць растлумачальнай і прапагандысцкай рабоце па пытаннях эканоміі энергарэсурсаў. Зараз прадуманая і эфектыўная работа ў гэтым напрамку не вядзецца. Няма ў інтэрнатах і на факультэтах адпаведнай нагляднай агітацыі. Думаецца, што, толькі ліквідаваўшы ўказаныя недахопы, можна разлічваць на поспех у справе эканоміі энергарэсурсаў.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта.**

**М. МАКАРЭВІЧ,**
**старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» механіка-матэматычнага факультэта.**

## Адрасат знойдзены?

«КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР» вымушаны зноў вярнуцца да пытання дастаўкі паштовай карэспандэнцыі ў інтэрнаты. Выпадкі дастаўкі яе не па адрасу адзначаліся ў публікацыях газеты «Беларускі універсітэт», матэрыялы праверак перадаваліся на рэагаванне ў Міністэрства сувязі БССР. Аднак складваецца ўражанне, што менш за ўсё гэта пытанне хвалюе студсаветы інтэрнатаў, якім было прапанавана рэгулярна правяраць сарціровачныя клеткі інтэрнатаў і тэрмінова вяртаць памылкова дастаўленую карэспандэнцыю паштальёну. Вырашана было ўключыць гэта ў абавязкі дзяжурных студэнтаў.

І вось факты. Толькі за адну праверку, праведзеную ў сакавіку ў інтэрнаце № 7, намі знойдзена 14 пісем, адрасаваных у суседні, шосты інтэрнат. Яны праляжалі больш за тыдзень. І вінавата ў гэтым не толькі і не столькі аддзяленне сувязі, колькі студсавет і непасрэдна яго старшыня.

**Г. КАНАПЛЯНІК,**
**член штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта.**

# Што за лічбамі?

ШТАБ «КАМСАМОЛЬСКАГА ПРАЖЭКТАРА» і акадэмічны сектар камітэта камсамола універсітэта сур'ёзную ўвагу ўдзяляюць пытанням паляпшэння якасці ведаў, вучэбнай дысцыпліны студэнтаў. Багатую інфармацыю для роздуму заўсёды даюць вынікі экзаменацыйнай сесіі. У апошнюю сесію яны нядрэнныя, назіраецца павышэнне ўзроўню паспяховасці па універсітэту ў цэлым.

Аднак давайце прааналізуем, хто ўносіць уклад у тыя злашчасныя працэнты непаспяховасці, якія з году ў год не даюць нам спакою. Аказваецца, адны і тыя ж студэнты. Возьмем, напрыклад, механіка-матэматычны факультэт, паспяховасць на якім у мінулую сесію была самай нізкай: крыху больш за 91 працэнт. Неабходна было б назваць прозвішчы тых студэнтаў, для якіх двойкі сталі звычайнай з'явай. На жаль, даводзіцца зноў абмяжоўвацца толькі лічбамі: такіх студэнтаў на мехмаце ні многа, ні мала — 36, або амаль сорак працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто мае запазычанасці. Назавём толькі некаторых з іх, якія маюць па выніках летняй, 1984 года, і цяперашняй сесій не менш чым дзве запазычанасці. Гэта М. Зелянкова (4-ы курс), Л. Манішкіна, А. Ляневіч, Н. Дрожжа 3-ці курс). Дзве запазычанасці ў зімовую сесію ў студэнткі 2-га курса Т. Талсташавай. Пастаянна ў дэканаце і на пасяджэннях вучэбна-выхаваўчай камісіі гучаць прозвішчы чацвёртакурснікаў І. Мазалеўскага і Г. Лукуць. У першага на дзень праверкі засталіся няздадзенымі два экзамены, а Г. Лукуць, акрамя гэтага, не здала яшчэ і залік па замежнай мове. Дарэчы, наведваннем занятказ яны таксама пахваліцца не могуць, бо бываюць на іх рэдка.

Легендарнымі на філалагічным факультэце сталі прозвішчы пяцікурснікаў В. Мчадлідзе, Г. Кандахчана, В. Граўцова. У іх запазычанасці па педагагічнай практыцы з мінулага года засталіся і ў гэтым. Не стала выключэннем і апошняя сесія: зноў двойкі, няяўкі на экзамены.

Спіс тых, хто мае запазычанасці, можна працягваць. Нельга не назваць прозвішчы студэнтаў-фізікаў С. Клешчука, П. Бартошыка, журфакаўца Л. Хракоўскага. Думаецца, што прыведзеных прыкладаў дастаткова.

Здзіўляе, што такі аналіз вельмі дрэнна праводзіцца вучэбна-выхаваўчымі камісіямі і камітэтамі камсамола факультэтаў, а адпаведна да гэтых студэнтаў не прымаюцца дастатковыя меры адміністрацыйнага і камсамольскага ўздзеяння. Надышоў час на ўсіх факультэтах з належнай прынцыповасцю разгледзець іх персанальныя справы. Спадзяёмся, што інфармацыя аб гэтым ад камітэтаў камсамола і вучэбна-выхаваўчых камісій у бліжэйшы час паступіць у штаб «Камсамольскага пражэктара» універсітэта.

**А. ЛЮБІМАЎ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбнай рабоце.**

**М. ЮРЫС,**
**член штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта.**

## ФІЗКУЛЬТУРА СПОРТ ФІЗКУЛЬТУРА

# НА П'ЕДЭСТАЛЕ — ТРЫ АЛЕНЫ

КАТОРЫ ГОД запар на станцыі «Зялёнае» пад Мінскам праходзіць першынство універсітэта па лыжных гонках. І сёлета спаборнічалі тут студэнты ўсіх адзінаццаці факультэтаў.

Першы дзень. Усе ў чаканні: невядома, як у гэтым годзе падрыхтаваліся зборныя каманды. Першымі стартавалі дзяўчаты на дыстанцыі 3 км. Пад другім нумарам прыняла старт Святлана Сяргеева (гістфак), за ёй праз мінуту — Алена Капылова (юрфак). Гэтыя дзяўчаты і задалі тэмп гонцы. А пад дваццаць пятым нумарам на дыстанцыю адправілася Алена Чэпік (гістфак), пад трыццаць восьмым — Алена Данільчанка (журфак). Аб напале барацьбы сведчыць той факт, што пераможцу ад другога прызёра аддзяляюць усяго 10 секунд, а ад трэцяга — васемнаццаць. Перамагла ў гэтай гонцы Алена Капылова, за ёй былі Алена Чэпік і Алена Данільчанка. На п'едэстале гонару стаялі тры Алены. Дарэчы, і ў мінулым годзе яны заваявалі прызавыя месцы.



Праз некалькі мінут прынялі старт юнакі на дыстанцыі 5 км. Тут лідэрства з першых метраў захапілі прадстаўнікі гістарычнага факультэта. Пад трэцім нумарам стартаваў Дзмітрый Семчанка, за ім — Вячаслаў Карповіч. Спрэчка прынцыповая. Хлопцы ідуць па лыжні вельмі хутка, апярэджваюць астатніх спартсменаў, але тут... У Дзімы ламаецца лыжнае мацаванне, і ён працягвае бег на адной лыжы. Слава скарачае разрыў. Дзіму даюць другую лыжу, ён стараецца нагнаць страчаныя секунды, але часу ўжо не вярнуць. І пераможцам становіцца В. Карповіч, які прабег дыстанцыю за 16 мінут 48 секунд. У Д. Семчанкі — 17,19. Трэцім у спрынтэрскай гонцы быў першакурснік юрфака Валера Ждановіч — 18,08.

Другі дзень. Надвор'е усталявілася добрае. Зімовае сонца, невялікі мароз, добрая лыжня спрыялі цудоўнаму настрою ўдзельнікаў спаборніцтваў. Гэты дзень нечаканасцей не прынёс. У дзяўчат на п'едэстал падняліся зноў тры Алены. Толькі адбыліся некаторыя змены ў размеркаванні прызавых месц. Дыстанцыю 5 км выйграла Чэпік — 17,33. Другою была Капылова — 18,38, трэцяй — Данільчанка — 19,07. Дзяўчаты паказалі такую хуткасць, якая была не пад сілу многім мужчынам.

На дыстанцыі 10 км у мужчын таксама адбыліся невялікія змены. Слава Карповіч і Дзіма Семчанка захавалі свае пазіцыі, а трэцяе месца заняў Юра Татульчанкаў (фізфак).

Перад стартам жаночай эстафеты 4×3 км ніхто не сумняваўся ў перамозе каманды гістфака. І сапраўды, Ларыса Баркова, Святлана Сяргеева і Алена Чэпік выйгралі свае этапы, і гістфак фінішаваў першым. Толькі праз многа хвілін другой з'явілася на фініш Алена Данільчанка, якая з сёмага месца змагла вывесці каманду журфака на другое. Гэта было нечаканым, як і тое, што трэцяе месца заняў геафак.

У мужчын на перамогу ў эстафеце 4×5 км прэтэндавалі чатыры факультэты. Перамаглі ж студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі. На другім месцы ішлі географы, але іх на апошнім этапе апярэдзілі гісторыкі.

Тры дні ўпартай і цікавай барацьбы размясцілі каманды ў наступным парадку:

| | |
|---|---|
| гістфак | 317 |
| геафак | 239 |
| юрфак | 206 |
| радыёфізікі і электронікі | 191 |
| фізфак | 151 |
| журфак | 105 |
| ФПМ | 101 |
| мехмат | 96 |
| хімфак | 59 |
| філфак | 58 |
| біяфак | 51 |

**А. ЛУКІН,**
**студэнт геаграфічнага факультэта.**

---

*З НАШАЙ ПОШТЫ*

# КРОЎ ДОНАРА ВЯРТАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАРТЫЯ І ЎРАД вялікую ўвагу ўдзяляюць ахове здароўя людзей, разумеючы, што здароўе народа — багацце дзяржавы. Мы дасягнулі грандыёзных поспехаў у развіцці медыцыны. Зараз у краіне поўнасцю ліквідаваны хваробы, якія раней забіралі сотні, а то і тысячы чалавечых жыццяў. Больш чым у два разы павялічылася працягласць жыцця людзей.

Здароўе — самае вялікае багацце чалавека. Але, на жаль, у яго шмат ворагаў, з якімі патрэбна змагацца. Часта здараецца, што ў выніку траўмы ці хваробы чалавек страчвае шмат крыві. Неабходна пераліванне. І тут на дапамогу прыходзяць людзі, пра якіх сказана шмат добрых і ўдзячных слоў — донары.

Зараз без пералівання крыві не існуе ні адна галіна медыцыны.

Нягледзячы на шматлікія намаганні вучоных усіх краін, да гэтага часу не знойдзены якія-небудзь штучныя сродкі, якія здольны замяніць усе лячэбныя якасці крыві. І таму лёсы людзей па-ранейшаму залежаць ад донара.

Наша краіна дасягнула значных поспехаў у развіцці донарства. Штогод у рады донараў толькі ў Беларусі уліваюцца больш за 50 тысяч чалавек, што дазваляе павялічваць запасы крыві. Дарэчы, толькі Мінску штодзённа неабходна кроў некальк х сотням чалавек.

Даказана, што самая вялікая колькасць крыві затрачваецца ў сучаснай хірургіі: пры складаных аперацыях на сэрцы, буйных сасудах, печані, нырках, мозгу і г. д. Так, для аперацыі з выкарыстаннем апарата штучнага кровазвароту неабходна мець 4 — 5 літраў донарскай крыві. Абменныя пераліванні крыві пры цяжкіх атраўленнях патрабуюць яе да 15 літраў.

Донарскі рух у БДУ імя У. І. Леніна за апошні год некалькі актывізаваўся. Больш арганізавана сталі праводзіцца дні донара, палепшыўся ўлік і захоўванне здаючых кроў, актывізавалася прапагандысцкая работа, да правядзення дзён донара больш шырока прыцягваецца санітарны актыў факультэтаў. Аднак універсітэт яшчэ значна адстае ад вышэйшых навучальных устаноў горада па колькасці здаючых кроў.

**З 25 па 29 сакавіка ў БДУ імя У. І. Леніна пройдуць дні донара. Абавязак кожнага з нас — студэнта, выкладчыка, супрацоўніка — прыняць актыўны ўдзел у здачы крыві, якая спатрэбіцца для выратавання жыцця людзей.**

Л. ФРАЛОЎ,
старшыня камітэта таварыства Чырвонага Крыжа універсітэта, кандыдат медыцынскіх навук.

---

## Шлях у краіну здароўя

# ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ЦЯБЕ

ШТО ТАКОЕ ЗДАРОЎЕ? Яшчэ старажытнарымскі ўрач Гален гаварыў аб гэтым так: «Той стан, пры якім мы не пакутуем ад болю і не абмежаваны ў сваёй жыццядзейнасці, мы называем здароўем».

Вялікі рускі крытык В. Р. Бялінскі заўважыў: «Без здароўя немагчыма і шчасце». А К. Маркс разглядаў адсутнасць здароўя, як «...абмежаванае ў сваёй волі жыццё». «Здароўе — усяму галава» — гаворыць руская прыказка. «Здароўе — самае вялікае багацце».— падтаквае ёй балгарская мудрасць.

Зразумела, што здароўе — самае галоўнае ў жыцці. Больш таго, здароўе і ёсць само жыццё з яго клопатамі, радасцямі, хваляваннямі, творчай працай, поспехамі і няўдачамі.

Мы можам раздзяляць людзей па ступені іх здароўя на тры групы.

Калі чалавек не адчувае болю, ні на што не скардзіцца, але пры невялікім намаганні, якое перавышае яго звычайную нагрузку, адчувае цяжкасць і не можа з ёю справіцца — гэты чалавек можа лічыць сябе практычна здаровым, ці здароўе яго — здароўе 1-й ступені. Яно бывае ў аслабленых людзей у маладым узросце або ў пажылых, якія растрацілі запас патэнцыяльнага здароўя, закладзены ў кожным чалавеку. Траціць то траціль, а вось папаўняць не спяшаліся. Пры разумным падыходзе да свайго здароўя яны могуць аднавіць страчанае.

Калі чалавек рэдка хварэе прастуднымі захворваннямі або наогул імі не хварэе, можа справіцца з незвычайна вялікімі нагрузкамі, то можна сказаць, што ў такога чалавека добрае здароўе, або здароўе 2-й ступені.

І нарэшце, калі чалавек можа пераадольваць вельмі вялікія нагрузкі, недасягальныя для большасці людзей, і спецыяльна трэніруецца для гэтай мэты, то мы яго можам аднесці да 3-й групы здароўя. Гэта гіперкампенсіраванае здароўе. Ім у большасці валодаюць спартсмены, касманаўты і іншыя, спецыяльна трэніраваныя людзі. Зрэдку такое здароўе сустракаецца і ў нетрэніраваных людзей. Яны атрымалі яго па «спадчыннаму коду». Але і яго патрэбна берагчы і ўдасканальваць. Любое здароўе, калі яго не ўдасканальваць, рана ці позна пачне пагаршацца.

Але чалавек толькі тады пачынае нешта рабіць для паляпшэння свайго здароўя, калі ў яго паяўляецца ідэя добрага здароўя, перакананасць у неабходнасці яго ўдасканалення. І ўсё ж галоўнае тут — жаданне і мэтанакіраванасць.

Ва ўсе часы існавалі пэўныя погляды на прынцыпы ўмацавання здароўя. І вялікі Гіпакрат — бацька медыцыны, і старажытнарымскі ўрач Гален, і легендарны Асклепій, і мудры Авіцэна, і выдатныя мысліцелі мінулага і цяперашняга стагоддзяў, такія, як Мудроў, фізіёлаг І. П. Паўлаў, вядомы кардыёлаг Амосаў і многія іншыя вылучалі ідэі ўмацавання здароўя. Але ў аснове сваёй яны былі падобныя адна на адну. Карацей, агульныя прынцыпы ўмацавання свайго здароўя абапіраюцца на адны і тыя ж палажэнні. Магчыма, ёсць розніца ў фармулёўках, вызначэннях ступені важнасці, але прынцыпы адны.

Большасць людзей, калі іх ужо наведала ідэя добрага здароўя, імкнуцца дасягнуць сваёй мэты пры дапамозе якога-небудзь аднаго сродку або спосабу. Асобы, фізічна аслабленыя, якія часта хварэюць, звяртаюцца ў асноўным да сістэмы фізічнай падрыхтоўкі, загартоўвання. А тыя, хто схільны да паўнаты, пачынаюць цікавіцца рознымі дыетамі, галаданнем. Асобы з павышанай раздражняльнасцю, нервознасцю пачынаюць вывучаць метады псіхічнага самаўздзеяння.

Добра гэта ці дрэнна? Безумоўна, добра, але аднабока, і таму рэзультат дасягаецца не хутка.

Добра хаця б таму, што чалавек пачынае нешта рабіць, і рабіць сам, прыкладаючы асабістыя намаганні.

Але ёсць яшчэ адна група людзей, якія імкнуцца стаць здаровымі шляхам пошуку дэфіцытных лекаў. Яны часта звяртаюцца да розных «шаптух». Лянота кіруе гэтымі людзьмі.

Аднак многія, кім авалодала ідэя добрага здароўя, не ведаюць пра неабходнасць комплекснага падыходу да пытанняў самаадналення.

Прынцыпы ўмацавання здароўя даволі простыя. Гэта больш рухацца, загартоўвацца, менш хвалявацца, есці не многа, але ежу, якая ўтрымлівае больш вітамінаў, мікраэлементаў, бялкоў, вугляводаў. І нарэшце, захоўваць аптымістычны погляд на жыццё. Прынцыпы простыя, але вось пытанне: як усё гэта перанесці на сябе?

Ю. МЕРЗЛЯКОЎ,
урач.

*(Працяг будзе).*

---

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.
21 сакавіка 1985 г.
Зак. 2389. АТ 13224.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ